# На зямлі беларускай

У лесе, што каля вёскі Барацінец, 23 верасня 1943 г. адбылося пасяджэнне Ваеннага Савета 50-й арміі, на якім у прысутнасці членаў беларускага ўрада пасланцы клятнянскіх партызан дакладвалі аб нямецкай абароне на рацэ Іпуць і аб умацаванні Хоцімска.

Усім прысутным стала зразумела, што нямецкае камандаванне асабліва моцна ўмацавала дарогі на Ершычы, Клімавічы, Крычаў, палохаючыся, каб рускія не адрэзалі іх праслаўленую групоўку, якая адыходзіла ад Бранска. Даныя, атрыманыя ад камандзіра Клятнянскай партызанскай брыгады маёра Фёдара Сямёнавіча Данчанкава, падмацоўваліся наяўнасцю свежых часцей праціўніка і яго супраціўленнем на рацэ Вараніца. Камандзір 46-га стралковага корпуса генерал Канстанцін Максімавіч Эрастаў далажыў, што вось ужо два дні, як дывізіі адбіваюць бесперапынныя контратакі праціўніка, нясуць страты, а прасоўванне зусім нязначнае, у той час як мае суседзі злева, асабліва палкоўнік Пётр Аляксеевіч Церамаў у Рухані і Разрытым, зачапіліся за той бераг Іпуці.

Камандарм генерал-лейтэнант Іван Васілевіч Болдзін, выслухаўшы ўважліва камандзіраў і свайго начальніка штаба арміі генерала Мікіту Рыгоравіча Брылёва і, ўлічваючы ўсё тое, што прынеслі клятнянскія партызаны, паглядзеў яшчэ раз на разгорнутую карту і аддаў загад на вядзенне бою часцямі арміі 24 верасня.

Звяртаючыся да камандзіра корпуса, ён сказаў:

— Вам, Канстанцін Максімавіч, прыйдзецца перайсці ў абарону па рацэ Вараніца, а ў цэнтры і на левым флангу армія-дывізія палкоўніка Сядуліна, дывізія Церамава і 110-я стралковая палкоўніка Арцем’ева з усімі танкамі і артылерыяй наваляцца на Іпуць.

Звяртаючыся да гэтых камдываў, Іван Васілевіч Болдзін патрабаваў ад усіх камандзіраў і палітработнікаў яшчэ раз напомніць воінам 50-й арміі, што яны першымі павінны ўвайсці на беларускую зямлю і што гэта павінна здзейсніцца сёння, 24 верасня.

Развітваючыся з пасланцамі клятнянскіх партызан, Іван Васілевіч прамовіў:

— 25 верасня дапаможаце корпусу Эраставa вызваліць Ершычы, адкрыць шлях на Клімавічы. Атрымаўшы пазыўныя радыёстанцыі і сігналы на бой, які павінен адбыцца, партызанскія разведчыкі пераправіліся цёмнай ноччу за Іпуць і зніклі ў клятнянскіх балотах.

У гэты ж дзень, 24 верасня, доўга стаяў туман над ракой, сваёй белай заслонай ахутваў прыбярэжныя вёскі. Сапёры наводзілі штурмавыя мосцікі для пяхоты і цяжкія — для танкаў і артылерыі.

Удары паследавалі пасля залпа «кацюш». 233-і танкавы полк з дэсантам пяхоты ад дывізіі Церамава першым накіраваўся па мастах за Іпуць. На пярэднім танку, прыцiснуўшыся да камандзірскага люка, імчаўся разведчык Зубовіч. Яго запаланілі перажыванні за род- ную зямлю. Як толькі быў знішчаны нямецкі гарнізон у вёсцы Чарнаўка, галаўны танк узяў накірунак на Малую Ліпаўку. Зубовіч дастаў з нагруднай кішэні сцяжок роднай Беларусі і прымацаваў да антэны танкавай радыёстанцыі. Механік танка, убачыўшы ўперадзе балота, спыніў машыну, але разведчык Зубовіч у гэты час крыкнуў камандзіру танкавай роты:

— Я ведаю аб’езд!

У 10.00 24 верасня 1943 г. перадавымі часцямі 50-й арміі вызвалены першыя метры беларускай зямлі. Камандзір танка, уперадзе якога бег разведчык Зубовіч, уключыў перадатчык і весела выгукнуў:

— Я — ЗАРА, у 10.00 дасягнуў мяжы Савецкай Беларусі! Развярнуліся для атакі пад Малой Ліпаўкай.

Гэтая радасная вестка абляцела ўсе войскі арміі і крылатай птушкай паляцела ў Маскву. А ўвечары ўся наша Радзіма слухала голас савецкай сталіцы. Дыктар Усесаюзнага радыё некалькі разоў паўтарыў:

— Войскі левага крыла Бранскага фронту 24 верасня прарвалі абарону праціўніка на рацэ Іпуць і ў 10.00 перасеклі граніцу Савецкай Беларусі.

Танкісты 233-га палка і воіны 3-га стралковага батальёна маёра І.Л. Чуба, вызваліўшы першую беларускую вёску Малая Ліпаўка, рыхтаваліся да заслужанага кароткага адпачынку. Ішла сяброўская гутарка за салдацкім кацялком з вячэрай. З лесу выходзілі старыя, жанчыны і дзеці, тыя, якім давялося схавац- ца ад фашысцкіх карнікаў. Яны абдымалі сваіх вызваліцеляў, расказвалі аб пражытых 800 днях у няволі. Старшыны тут жа, на ўзлеску, кармілі жыхароў вызваленых вёсак. Малодшы сяржант Зубовіч на сваёй роднай мове вёў задушэўную гутарку са сваімі землякамі, расказваў аб магутнай сіле Чырвонай Арміі, аб тым блізкім дні, калі Савецкая Беларусь стане назаўсёды вольнай. «Мы далі клятву мацней біць фашыстаў і з гонарам выканаем яе!»

А ў штабе арміі генерал М.Р. Брылёў на золку прымаў данясенні. Дакладваў камандзір 324-й стралковай дывізіі палкоўнік Сядулін, што адзін з яго палкоў вызваліў беларускую вёску Гаўрылоўку і чатырыста гектараў беларускай зямлі. Паведаміў камандзір 380-й стралковай, што ў 22.00 яго палкі ўступілі на беларускую зямлю. Пазваніў палкоўнік П.А. Церамаў і папрасіў дазволу начной атакай выбіць немцаў з Вялікай Ліпаўкі. У гэты час член Ваеннага Савета арміі генерал А.М. Карамышаў з работнікамі палітаддзела рыхтавалі зварот да воінаў арміі, якія ўступілі на беларускую зямлю.

Фашысты любой цаною імкнуліся не дапусціць часці Чырвонай Арміі ў межы Беларусі. Яшчэ толькі пачало світаць, як немцы з боку Хоцімска пачалі контратакі. Увесь дзень ішлі крывавыя баі за кожны метр беларускай зямлі. Асабліва мужна змагалася з ворагам 108-я стралковая. За дзень прыйшлося адбіць восем контратак праціўніка. Разведчыкі знай шлі вольны шлях ад мін і дапамаглі танкістам атакаваць Узлогі. 3-і стралковы батальён утрымліваў паўднёвую частку ўскраіны Малой Ліпаўкі. Запамятаўся ім надоўга гэты гарачы бой 25 верасня. Варожыя атакі следавалі адна за адной. Пад прыкрыццём кулямётаў нашы сапёры замініравалі дарогу, якая ішла з Хоцімска, на якой падарвалася некалькі танкаў праціўніка. Але атакі фашыстаў не спыняліся. Тады камандуючы арміі вырашыў кінуць свой рэзерв — 110-ю стралковую дывізію марской пяхоты. Марскія пехацінцы праславілі сябе не толькі на берагах Нявы і Крыма: іх слава ідзе ад сцен Сталінграда, ад Курскай дугі, ад берагоў Дзясны і вось прыйшла на беларускую зямлю.

Сонца хілілася да захаду. Яго чырвоны дыск схаваўся за першым беларускім горадам Хоцімскам, які трэба было вызваліць сёння, бо заўтра будзе позна: фашысты спаляць, разграбяць, угоняць жыхароў. Іван Васілевіч Болдзін прыбыў на назіральны пункт да Церамава, дзе ўжо знаходзіўся і камандзір дывізіі марской пяхоты палкоўнік Арцем’еў. Паглядзеўшы ў стэрэатрубу на Хоцімск, які быў бачны ўдалечыні, камандарм даў каманду:

— Горад трэба вызваліць сёння ноччу. Гэта задача вам абодвум, ды плюс 233-і танкавы полк і 313-ы гвардзейскі мінамётны полк.

Штосьці прыкінуўшы на карце, загаварыў камандзір 108-й стралковай дывізіі палкоўнік Церамаў:

— Да раніцы Хоцімск вызвалім. Я буду двума палкамі наступаць уздоўж дарогі з Ліпаўкі і ўдару па цэнтры.

Спакойны, павольны на словы, але гарачы ў баі, Арцем'еў дадаў:

— Мае два палкі з наступленнем цемры ўвойдуць у бой збоч в. Узлогі і Хоцімск атакуюць з поўдня.

На развітанне камандарм напомніў, што неабходна паслаць у Хоцімск разведчыкаў, не дапусціць падпалу горада і захапіць мост цераз раку Беседзь.

Так ноччу з 25 па 26 верасня пачаўся бой за першы горад на беларускай зямлі.

Яшчэ вакол ішоў бой, не рассеяўся туман над рэчкай Беседзь, а ў штаб Бранскага фронту ляцела данясенне: «26 верасня 1943 года ў 7 гадзін 30 хвілін раніцы часці 108-й і 110-й стралковых дывізій вызвалілі першы горад на зямлі беларускай — Хоцімск».

Усю ноч ішоў гарачы бой: з поўдня і паўднёвага ўсходу наступалі батальёны 110-й дывізіі марской пяхоты. Гэта яны імклівай атакай выбілі праціўніка з Бяседавіч і на плячах ворага фарсіравалі Беседзь, авалодалі Сасноўкай і з поўдня ўварваліся ў Хоцімск. Прадбачлівы камдыў палкоўнік Арцем'еў гэтым смелым начным манеўрам не толькі захапіў варожыя батарэі, але знішчыў атрады жандармерыі і паліцыі, якія хацелі ўгнаць жыхароў і падпаліць пасёлак Хоцімск, што размешчаны за рэчкай Беседзь.

У гэты час стралковыя батальёны 108-й дывізіі палкоўніка Церамава з танкамі 233-га танкавага палка цёмнай ноччу па дзвюх дарогах ад Малой Ліпаўкі і Вялікай Ліпаўкі наступалі на Хоцімск. Трэці стралковы батальён маёра І.Л. Чуба яшчэ да пачатку атакі, хаваючыся ў цемры верасnёўскай ночы, накіраваўся балотам на захад. Яго задача была — адрэзаць ворагу адыход з горада Клімавічы. Уперадзе, абмацваючы кожную купінку, рухаліся бясстрашныя разведчыкі: Зубовіч, Тутсамбаеў, Чарнышоў. Заўважыўшы полымя пажару ў вёсцы Альшоўка, воіны Накіраваліся ўперад. Фашысцкія малойчыкі падпалілі пакінутую вёску, падштурхоўваючы прыкладамі старых і дзяцей, выганялі іх на дарогу. Чуліся кароткія аўтаматныя чэргі — гэта гестапаўцы разраджалі аўтаматы ў тых, хто перашкаджаў падпалынчыкам рабіць свае чорныя справы. Воінаў трэцяга батальёна ахапіла лютасць. Яны скінулі шынялі і кінуліся наперарэз фашыстам. У рукапашнай схватцы ўсе фрыцы былі знішчаны. Тое, што адбылося за некалькі хвілін, жыхары Альшоўкі ніколі не забудуць. Толькі бязмежнай храбрасцю, мужнасцю і адвагай, праяўленай воінамі ў начной атацы за Хоцімск, удалося выратаваць горад і яго жыхароў ад фашысцкай навалы.

Малодшы сяржант Зубовіч са сваімі неразлучнымі сябрамі — разведчыкамі Мікалаем Чарнышовым і Тутсамбаевым пасля авалодання 3-м стралковым батальёнам Альшоўкі накіраваліся да супрацьтанкавага рова. Яшчэ на Дзясне мы, воіны 50-й арміі, чулі аб хоцімскай трагедыі. Фашысцкія палачы сагналі ўсё яўрэйскае насельніцтва паўднёва-ўсходняй часткі Магілёўскай вобласці ў Хоцімск да супрацьтанкавага рова, некалькі гадзін расстрэльвалі іх з аўтаматаў. Перад гэтай жудаснай часінай асуджаных на смерць жорстка катавалі. Грудных дзяцей закопвалі жывымі або дабівалі прыкладамі. Хоцімская трагедыя адбылася 4 верасня, але яшчэ доўга варушылася над супрацьтанкавым ровам зямля. Усё гэта вельмі добра ўрэзалася

ў памяць воінам Чырвонай Арміі, асабліва разведчыку Зубовічу і яго сябрам, якія першымі трапілі сюды.

Супрацьтанкавы роў, выкапаны яшчэ ў 1941 'г., акружаў Хоцімск з захаду. Зубовіч гэта добра ведаў і на досвітку 26 верасня разам з сябрамі спяшаўся на палітую кроўю зямлю. Цяжка перадаць стан разведчыкаў і ўсяго 3-га стралковага батальёна, якія са знятымі каскамі стаялі на месцы злачынства. Слёзы сыпаліся з вачэй, а рука воіна сціскала мацней аўтамат. Кожны разум'еў, што толькі пасля поўнага знішчэння фашысцкага звера на зямлі можна выратаваць чалавецтва.

Непрыкметна сюды пад’ехала некалькі машын. З іх выйшлі члены ЦК Кампартыі Беларусі і члены ўрада, камандуючы арміі і член Ваеннага Савета. Скінуўшы шапкі, яны доўга стаялі з апушчанымі галовамі ля супрацьтанкавага рова, дзе знаходзіліся астанкі замучаных патрыётаў на беларускай зямлі.

Генерал-маёр А. М.Карамышаў — член Ваеннага Савета падышоў да воінаў стралковага батальёна маёра І.Л. Чуба і сказаў:

— Пакуль у нашых грудзях б’ецца сэрца, гэтага забыць нельга.

І ў адказ прагучала:

— Не забудзем!!!

Разгромленыя фашысцкія часці на Іпуці і ў Хоцімску спяшаліся за Сож, разбуралі на сваім шляху дарогі, масты, спальвалі ўсе пабудовы. Жыхары кідалі свае хаты і ўцякалі ў лясы, бо фашысты гналі іх на захад або расстрэльвалі. Вечарам 26 верасня бой грымеў у Хацімчы і Ельні, Бярозках і Канічах, а ў вызваленым Хоцімску пачалося мірнае жыццё.

Людзі са сваім бедным скарбам вярталіся з лясоў і балот. Першымі, як заўсёды, прыбеглі ў гарадскі сад дзеці. Тут на адпачынак пасля цяжкага бою за першыя метры беларускай зямлі, размясцілася 108-я стралковая дывізія палкоўніка П.А. Церамава. Усе жыхары сабраліся пад векавыя ліпы гарадскога парку, каб убачыць сваіх вызваліцеляў, пачуць словы аб Радзіме, аб дарагой Маскве, расказаць самім аб перажытых днях у няволі.

Так адбыўся без усялякай аб΄явы першы мітынг на вызваленай зямлі ў першым маленькім гарадку Хоцімск. На ім прысутнічалі кіраўнікі партыі і ўрада Беларусі і камандаванне 50-й арміі, воіны, камандзіры, жыхары — усё злілося ў адзіную плынь, плынь чалавечай радасці, чалавечага шчасця.

*М.Д. Максімцаў, генерал-маёр,*
*начальнік штаба інжынерных войск 50-й арміі,*
*удзельнік вызвалення Хоцімска.*

**Максімцаў, М. Д.** На зямлі беларускай : [аб вызваленні Хоцімскага раёна ад нямецка-фашыцкіх захопнікаў] / М. Д. Максімцаў // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Хоцімскага раёна / рэдкалегія: Г. П. Пашков (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2003. — Ішла вайна народная. — С. 284—287.